синий и фиолетовый. Первоначально учёный обнаружил пять цветовых оттенков в радуге. Впоследствии Ньютон добавил к ним ещё два цвета. Число семь он выбрал из убеждения, что существует связь между цветами, музыкальными нотами, объектами Солнечной системы и днями недели.

Однако не все согласны с Ньютоном. Например, американцы, немцы, французы и японцы считают, что у радуги шесть цветов. В Китае в радуге выделяют пять цветов. А некоторые племена Африки уверены, что у радуги всего два цвета: тёмный и светлый.

**Слоўнік**

первоначально — *першапачаткова*
обнаружить — тут: *выявіць*
оттенок — *адценне*
впоследствии — *пасля, пазней*
убеждение — *перакананне*

Падкрэсліце ўжытыя ў тэксце лічэбнікі. Вызначце іх разрад паводле будовы.

**365.** Выкарыстоўваючы розныя спалучэнні простых і складаных лічэбнікаў, утварыце і запішыце сем састаўных колькасных лічэбнікаў.

Шаснаццаць, тысяча, дзвесце, пяцьдзясят, восем.

## § 59. Простыя колькасныя лічэбнікі, іх скланенне, ужыванне і правапіс

Лічэбнік ***адзін*** мае форму мужчынскага, жаночага і ніякага роду, адзіночнага і множнага ліку: *адзін месяц, адна хвіліна, адно імгненне, адны суткі*.

Гэты лічэбнік скланяецца, як прыметнікі з асновай на цвёрды і зацвярдзелы зычныя.

**366.** Дапоўніце прыметнікамі словазлучэнні, якія прыводзяцца ў якасці прыкладаў у тэксце правіла, і праскланяйце іх (па варыянтах). Напрыклад: *Н. адзін зімовы месяц, Р. аднаго зімовага месяца...* Дакажыце, што лічэбнік *адзін* скланяецца, як прыметнікі з асновай на цвёрды і зацвярдзелы зычныя.

**367.** Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары і ўжываючы лічэбнікі, што ў дужках, у патрэбнай склонавай форме.

1. Баба выціралася *(адзін)* ручніком, дзед з хросным — другім, а я ўжо, як у тым анекдоце, а..сыхаў і так *(Я. Брыль)*. 2. Вавёрка саскочыла з с..сны і ў *(адна)* хвіліну апынулася на пн..[сн] *(В. Вольскі)*. 3. З *(адзін)* боку д..рогі стаяў рэдкі хвойнік, з другога — кусты ядлоўц.., а далей — алешнік *(Я. Колас)*. 4. Лёня Саўчанка і Грыша Міхневіч вучыліся ў *(адзін)* клас.., с..дзелі за *(адна)* партай *(А. Васілевіч)*.

Укажыце род, лік і склон лічэбніка *адзін* у кожным сказе.

**368.** Прачытайце табліцу.

| Склон | Скланенне лічэбнікаў *два, дзве* | |
|---|---|---|
| Н. | *два дубы, два сябры* | *дзве таполі, дзве сяброўкі* |
| Р. | *двух дубоў, двух сяброў* | *дзвюх таполяў, дзвюх сяброўак* |
| Д. | *двум дубам, двум сябрам* | *дзвюм таполям, дзвюм сяброўкам* |
| В. | *два дубы, двух сяброў* | *дзве таполі, дзвюх сяброўак* |
| Т. | *двума дубамі, двума сябрамі* | *дзвюма таполямі, дзвюма сяброўкамі* |
| М. | *(на) двух дубах,*<br>*(пры) двух сябрах* | *(на) дзвюх таполях,*<br>*(пры) дзвюх сяброўках* |

З назоўнікамі якога роду ўжываюцца лічэбнікі *два, дзве*?

У якім склоне і ліку ўжываюцца назоўнікі пры лічэбніках *два, дзве* ў форме назоўнага склону? Ад чаго залежыць форма лічэбнікаў *два, дзве* ў вінавальным склоне?

!

У **назоўным склоне** пры лічэбніках ***два, дзве, тры, чатыры*** назоўнікі і прыметнікі ўжываюцца ў форме назоўнага склону множнага ліку: *два спрытн**ыя** вераб'**і**, тры малад**ыя** цацэрук**і***.

У **творным склоне** лічэбнікі ***два, дзве, тры, чатыры*** заканчваюцца на *-**ма***: *дву**ма**, дзвю**ма**, тры**ма**, чатыр**ма***.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**369.** Запішыце ўжытыя ў сказах колькасна-іменныя словазлучэнні ў форме творнага склону.

1. Праз лес ішлі дзве дарогі *(А. Васілевіч)*. 2. Ігруша была ўжо голая, і толькі на адной галіне трапяталіся два жоўт.. лістк.. *(К. Чорны)*. 3. Раптам над ракою загарэліся тры сін.. ракеты *(М. Лупсякоў)*. 4. Я вырашыў не ісці ў горад, а пехатой вярнуцца дадому, у сваю вёску, да якой было чатыры кіламетр.. *(А. Бадак)*. 5. Як дзве стар.. гаспадыні ў белых хустках, стаяць адна супроць адной дзве[ф] хаткі *(З. Бядуля)*.

Растлумачце правапіс прапушчаных канчаткаў назоўнікаў і прыметнікаў.

**370.** Прачытайце табліцу.

| Склон | Скланенне простых колькасных лічэбнікаў | | |
|---|---|---|---|
| Н. | *пяць паверхаў* | *восем кілаграмаў* | *сямнаццаць рублёў* |
| Р. | *пяці паверхаў* | *васьмі кілаграмаў* | *сямнаццаці рублёў* |
| Д. | *пяці паверхам* | *васьмі кілаграмам* | *сямнаццаці рублям* |
| В. | *пяць паверхаў* | *восем кілаграмаў* | *сямнаццаць рублёў* |
| Т. | *пяццю паверхамі* | *васьмю кілаграмамі* | *сямнаццаццю рублямі* |
| М. | *(на) пяці паверхах* | *(аб) васьмі кілаграмах* | *(аб) сямнаццаці рублях* |

Дакажыце, што прыведзеныя лічэбнікі скланяюцца, як назоўнікі трэцяга скланення з мяккай асновай.

!

Лічэбнікі ***пяць — дваццаць, трыццаць*** скланяюцца, як назоўнікі трэцяга скланення з мяккай асновай. У лічэбніках ***пяць, дзевяць — дваццаць, трыццаць*** у творным склоне перад канчаткам пішацца ***цц***: *пяццю, дваццаццю.*

У лічэбніках ***адзінаццаць — дваццаць, трыццаць*** у сярэдзіне пішацца ***цц***.

Ва ўскосных склонах, акрамя вінавальнага, лічэбнік ***восем*** пішацца з мяккім знакам.

**371.** Разгледзьце шыльду. Пісьмова адкажыце на пытанні. Лікі запішыце словамі.

З якога часу пачынае працаваць аддзяленне паштовай сувязі? Да якога часу працуе аддзяленне ў будныя дні, у суботу? У які час аддзяленне закрываецца на перапынак?




***аддзяле́нне***

**372.** Прачытайце табліцу.

| Склон | Скланенне лічэбнікаў *сорак, сто* | |
|---|---|---|
| Н. | *сорак метраў* | *сто літраў* |
| Р. | *сарака метраў* | *ста літраў* |
| Д. | *сарака метрам* | *ста літрам* |
| В. | *сорак метраў* | *сто літраў* |
| Т. | *сарака метрамі* | *ста літрамі* |
| М. | *(на) сарака метрах* | *(у) ста літрах* |

Колькі склонавых форм маюць лічэбнікі *сорак* і *сто*?

! Лічэбнікі ***сорак, сто*** ва ўсіх склонах, акрамя назоўнага і вінавальнага, маюць канчатак ***-а***: *ст[а], сарак[а]*.

**373.** Прачытайце тэкст. Раскажыце, як можна вызначыць час па «кветкавым гадзінніку». Якая расліна засынае ў 6 гадзін вечара?

— Ці ведаеш ты, як вызначыць час без гадзін..іка? — спытаў Мікола.

— В..дома, — а..казала Ірэна. — Цюльпаны веч..рам закрываюць п..лёсткі. Жоўтыя[м] дз..мухаўцы пад маім ..акном у 6 раніцы ўжо ра..крытыя, а пасля 15—16 гадзін засынаюць. Падбел прачынаецца ў 10, а засынае ў 18. Шыпшына хоць і рана прачынаецца, але кладзецца спаць пасля 20 гадзін. А салаў..і пачынаюць сп..ваць звеч..ра, каля 11 гадзін *(Паводле Л. Адамовіч)*.

Спішыце тэкст, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары. Лікі запішыце словамі.

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**402.** Складзіце колькасна-іменныя словазлучэнні з лічэбнікамі *паўтара*, *паўтары* і прыведзенымі назоўнікамі.

Тона, стагоддзе, гадзіна, кіламетр, лыжка, літр, цэнтнер.

Запішыце словазлучэнні ў форме творнага склону.

## § 64. Скланенне, ужыванне і правапіс зборных лічэбнікаў

**!**

**Зборныя** лічэбнікі ***двое, трое, чацвёра, пяцёра, шасцёра, сямёра, васьмёра, дзевя́цера, дзеся́цера*** абазначаюць колькасць прадметаў як сукупнасць, адно цэлае.

Зборныя лічэбнікі ўжываюцца:

- з назвамі асоб мужчынскага полу: *сямёра спартсменаў*;
- з назвамі маладых істот: *чацвёра шчанят*;
- з назоўнікамі, якія ўжываюцца ў форме толькі множнага ліку: *двое нажніц*;
- з назоўнікамі *дзеці, людзі, коні, гусі, свінні*;
- з асабовымі займеннікамі: *іх было трое*;
- з прыметнікамі, якія перайшлі ў назоўнікі: *двое дзяжурных*.

**403.** Складзіце і запішыце колькасна-іменныя словазлучэнні, выбіраючы з дужак назоўнікі, якія спалучаюцца са зборнымі лічэбнікамі.

Пяцёра[сл] (*жанчыны, дзеці*), трое (*дзверы, сталы*), васьмёра (*качаняты, качкі*), двое (*мастакі, мастачкі*), чацвёра (*быкі, коні*).

**404.** Прачытайце табліцу.

| Склон | Скланенне зборнага лічэбніка |
|---|---|
| Н. | *пяцёр[а] шэр[ых] кацянят* |
| Р. | *пяцяр[ых] шэр[ых] кацянят* |
| Д. | *пяцяр[ым] шэр[ым] кацянятам* |
| В. | *пяцяр[ых] шэр[ых] кацянят* |
| Т. | *пяцяр[ымі] шэр[ымі] кацянятамі* |
| М. | *(аб) пяцяр[ых] шэр[ых] кацянятах* |

Дакажыце, што зборныя лічэбнікі скланяюцца, як прыметнікі множнага ліку.

**405.** Утварыце ад колькасных лічэбнікаў, якія абазначаюць цэлыя лікі, зборныя. Запішыце іх у форме роднага склону.

У з о р. *8 — восем — васьмёра, васьмі — васьмярых.*

6, 3, 5, 2, 4, 9, 7.

> **!** Да зборных лічэбнікаў адносяцца лічэбнікі ***абодва, абедзве, абое.***
>
> Лічэбнік ***абодва*** спалучаецца з назоўнікамі мужчынскага і ніякага роду: *абодва ўнукі, абодва крэслы*; лічэбнік ***абедзве*** — з назоўнікамі жаночага роду: *абедзве ўнучкі, абедзве канапы.*
>
> Лічэбнікі ***абодва, абедзве*** скланяюцца, як лічэбнікі *два, дзве.*
>
> Для абазначэння асоб і мужчынскага, і жаночага полу ўжываецца лічэбнік ***абое***: *Маці з сынам абое сядзелі на тапчане* (І. Чыгрынаў).

**406.** Пісьмова праскланяйце адно з колькасна-іменных словазлучэнняў, якія прыводзяцца ў тэксце правіла ў якасці прыкладаў.

**407.** Запішыце сказы, выбіраючы з дужак патрэбныя лічэбнікі. Абгрунтуйце свой выбар.

1. Выбраўся з начных хмар поўны месяц, і лес па *(абодва/абедзве)* бакі дарогі адразу пачарнеў, як сцяна *(А. Федарэнка)*. 2. Слабы водсвет[ф] пранікáў сюды толькі з *(абодвух/абедзвюх)* канцоў калідора *(З. Бядуля)*. 3. Вясною, як ападзе паводка, і летам на *(абодвух/абедзвюх)* берагах успыхвае рознакаляровы пажар кветак *(З. Прыгодзіч)*. 4. У баі загінулі адважны Рагвалод і *(абое/абодва)* яго сыны *(У. Бутрамееў)*.

Які сказ адпавядае прыведзенай схеме? [═══ ———], і [——— ═══].

**408.** Прачытайце тэкст, ужываючы лічэбнікі, што ў дужках, у патрэбнай склонавай форме.

Па алеях праходзяць людзі, то заклапочаныя, то вясёлыя, то задуменныя. Мая ўвага спынілася на *(трое)*.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

Па дарожцы да аэрадрома ішла жанчына, высокая, светлавалосая, у прыгожай стракатай сукенцы. Па баках у жанчыны ішло двое юнакоў. Адзін, старэйшы, гадоў *(дваццаць тры)*, высокі, танклявы. Другі крышку маладзейшы[м], шыракаплечы. На *(абодва)* хлопцах былі новенькія, з іголачкі, касцюмы, бялюткія кашулі. І абодва такія сімпатычныя! Адразу было відаць, што юнакі — браты, а жанчына — іх маці.

Растлумачце значэнне фразеалагізма *з іголачкі*.

Зрабіце пісьмовы марфалагічны разбор трох лічэбнікаў з тэксту (парадак і ўзоры разбору змешчаны на форзацы 1).

**409.** Выканайце інтэрактыўнае заданне па тэме «Спалучэнне лічэбнікаў з назоўнікамі».

## Правяраем сябе

1. Што абазначае лічэбнік як часціна мовы?
2. На якія разрады падзяляюцца лічэбнікі ў залежнасці ад значэння і граматычных прымет? Прывядзіце прыклады.
3. На якія разрады падзяляюцца лічэбнікі ў залежнасці ад будовы?
4. Як можа перадавацца значэнне прыблізнай колькасці? Прывядзіце ўласныя прыклады.
5. З назоўнікамі якога роду ўжываюцца лічэбнікі ***паўтара*** і ***паўтары***, ***абодва*** і ***абедзве***?
6. З якімі назоўнікамі спалучаюцца зборныя лічэбнікі?

**410.** Пісьмова адкажыце на пытанні. Лікі запішыце словамі.

Калі ў нашай краіне адзначаюцца наступныя дзяржаўныя святы: Дзень Канстытуцыі, Дзень Перамогі, Дзень Незалежнасці?

Калі беларусы святкуюць Дзень жанчын, Дзень ведаў, Дзень маці?

Лічэбнікі якога разраду паводле значэння і граматычных прымет вы выкарысталі?

Раскажыце пра тое, якія традыцыі святкавання дзяржаўных свят, святочных дзён скlаліся ў вашай сям'і, школе. Якія пачуцці выклікаюць у вас гэтыя традыцыі?